■ Ведай сваіх!

# «МІСТАР КАРЭЛІЧЫ»: ГАСПАДАРЛІВЫ, РАЗУМНЫ, НЕЖАНАТЫ...

**Што аб'ядноўвае супрацоўніка Дэпартамента аховы, спецыяліста электрасетак і прадстаўніка аддзела па надзвычайных сітуацыях? Усе яны — удзельнікі новага для Карэліцкага раёна конкурсу «Містар Карэлічы — 2017». Свае здольнасці, якасці і ўменні тут дэманструюць не прыгажуні, як мы прывыклі, а маладыя спецыялісты раёна.**




Удзельнікі конкурсу «Містар Карэлічы — 2017» паказалі кулінарны клас.

Мэтай спаборніцтваў быў пошук сярод дужай паловы самай яркай, творчай, спартыўнай і здаровай асобы на Карэліччыне. Арганізатары мерапрыемства хацелі такім чынам падтрымаць таленавітую моладзь, папулярызаваць беларускую культуру і моду.

А вось для мясцовых дзяўчат, думаецца, гэта відовішчнае свята стала яшчэ і своеасаблівымі агледзінамі патэнцыйных жаніхоў. Дзе, як не тут, за адзін вечар убачыш, як хлопцы абіраюць бульбу, прышываюць гузікі, забіваюць цвікі, гатуюць фірменную страву і нават выносяць смецце. Праверка на гаспадарлівасць была адным з заданняў конкурсу.

Розум, трапнасць і трываласць хлопцы паказвалі ў інтэлектуальных і спартыўных спаборніцтвах. Тытул «Містар Спорт», дарэчы, заваяваў **Вячаслаў МІСЕЛЯ, супрацоўнік Карэліцкага аддзела па надзвычайных сітуацыях.** А званне «Містар Інтэлект», на думку журы, заслужыў **Аляксандр СІРОЦІН, работнік Карэліцкага аддзялення Дэпартамента аховы.**

Больш за ўсіх пашанцавала **Віктару ХВЯСЬКО з філіяла «Карэліцкі раён электрычных сетак».** Ён стаў не толькі «Містарам Крэатыўнасць», але і атрымаў прыз глядацкіх сімпатый.

— Такі конкурс мы арганізавалі ў раёне ўпершыню. Магчыма, таму хлопцы крыху засаромеліся, і ўдзельнікаў было няшмат. Затое гэта дакладна былі самыя лепшыя, — падзялілася ўражаннямі **Валянціна ВІШНЕЎСКАЯ, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Карэліцкага райвыканкама.** — Спаборніцтвы такога кшталту сярод дужай паловы — з'ява неардынарная і, як аказалася, цікавая. Усе атрымалі масу пазітыўных эмоцый. Думаю, наступным годам удзельнікаў стане больш і конкурс прыжывецца.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Дзіцячае «Еўрабачанне»

# «Крылы» ўзнеслі на вяршыню

**Расія выйграла дзіцячы песенны конкурс**

**Расіянка Паліна Багусевіч** ***(на фота)*** **з песняй «Крылы» атрымала перамогу ў дзіцячым конкурсе песні «Еўрабачанне-2017», які прайшоў у Тбілісі ў мінулую нядзелю. 188 балаў забяспечылі ёй першае месца, другое — са 185 баламі — у гаспадароў — Грыгола Кіпшыдзе з песняй «Голас сэрца», трэцяе дасталася аўстралійцы Ізабэле Кларк — 172 балы, песня «Скажы!».**




Хелена Мераакі, якая прадставіла Беларусь, стала пятай, атрымаўшы 149 балаў за песню «Я самая», у пяцёрцы таксама бой-бэнд з Нідэрландаў Fource, 156 балаў. Далей месцы размеркаваліся наступным чынам: Арменія (148 балаў), Украіна (147), Польшча (138), Мальта (107), Сербія (92), Італія (86), Македонія (69), Албанія (67), Партугалія (54), Ірландыя (54) і Кіпр (45).

Паліне Багусевіч 14 гадоў, на сцэне з ранняга дзяцінства, цяпер вучыцца ў Акадэміі Ігара Крутога. У 2014-м юная спявачка прайшла адбор у першы сезон шоу «Голас. Дзеці», выбрала каманду Дзімы Білана, але выбыла падчас «паядынкаў». На «Дзіцячай Новай хвалі — 2014» Багусевіч заняла другое месца. Перамога Паліны стала другой для расіян на дзіцячых Еўра — у 2006 годзе ў Бухарэсце перамаглі сёстры Марыя і Насця Талмачовы. Больш за ўсё — тры разы — на дзіцячым «Еўрабачанні» перамагалі прадстаўнікі якраз-такі Грузіі. Беларусь, Мальта, а цяпер і Расія выйгралі конкурс двойчы. Журналістам Паліна Багусевіч прызналася, што адчувае змяшаныя пачуцці. З аднаго боку, яна рада перамозе, з другога — засмучаная тым, што ўсё завяршылася. Перамогу на дзіцячым «Еўрабачанні» Паліна лічыць годным крокам і самым вялікім дасягненнем у сваім творчым жыцці.

Як паведамлялася раней, у гэтым годзе 50% ад набраных балаў вызначала галасаванне гледачоў, яшчэ 50% — ацэнкі прафесійнага журы. Таксама ў гэтым годзе ўпершыню гледачы галасавалі толькі анлайн — на сайце конкурсу, без тэлефонных званкоў і СМС, прычым галасаванне пачалося яшчэ за два дні да фіналу. Але гэтая схема дала тэхнічны збой — апошнія 15 хвілін галасавання спынілі работу сайта. Ёсць меркаванне, што гэта магло адбіцца на выніках, але даведацца пра гэта цяпер ужо немагчыма. Цікава, што нацыянальнае журы розных краін паставіла Беларусь на пятае месца (80 балаў), а згодна з вынікамі галасавання гледачоў Хелена Мераакі стала чацвёртай (69 балаў).

Ну, і самае галоўнае — наступнае дзіцячае «Еўрабачанне» пройдзе ў Беларусі, таксама ў лістападзе. Чакаем і рыхтуемся!

**Іван КУПАРВАС,** *hvir@zviazda.by*

■ Надвор'е

# НА ДАРОГАХ ГАЛАЛЁДЗІЦА...

**Сіноптыкі абяцаюць у сераду на працягу сутак ад мінус 3 да плюс 3 градусаў**

**У апошнія дні восені на тэрыторыі краіны будуць гаспадарыць атмасферныя франты, таму чакаецца няўстойлівае надвор'е з ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Нягледзячы на тое што тэмпературны фон у найбліжэйшыя дні ў параўнанні з мінулымі выхаднымі панізіцца, ён па-ранейшаму будзе вышэйшы за кліматычную норму, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду атмасферныя франты з Заходняй Еўропы прынясуць на большую частку тэрыторыі краіны ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, уначы па ўсходзе пры праясненнях да 4—6 марозу.

Захаваецца няўстойлівае надвор'е і ў чацвер. Мокры снег будзе чаргавацца з дажджом. У асобных раёнах чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Удзень будзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, па Гомельскай вобласці месцамі тэмпература павысіцца да 6 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першы дзень зімы — 1 снежня — чарговая хваля актыўных атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы, выкліча на большай частцы тэрыторыі краіны ападкі (мокры снег, дождж). Уначы і раніцай месцамі чакаюцца моцныя ападкі, якія будуць суправаджацца парывістым ветрам. Месцамі ўтворыцца туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 4, удзень — ад нуля да 6 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЛІСТАПАД У ПЕЧАХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Случчанін Вячаслаў Вараб'ёў халоднай лістападаўскай раніцай пакідае Печы. За плячыма — паўтара года, праведзеных тут. Хлопец пераходзіць на той бок КПП з лычкамі сяржанта на пагонах.

— Я быў намеснікам камандзіра ўзвода. Атрымаў спецыяльнасць камандзіра мінамётнага разліку. Больш за ўсё і запомніліся першыя стрэльбы... Што да характару, то стаў больш адказны. Усё-такі за кожнага падначаленага спаганялі з мяне. Людзі ж прыходзяць з рознымі ўстаноўкамі, і трэба было знайсці паразуменне з кожным, каб калектыў быў згуртаваны.

А мы кіруемся на плац, дзе займаюцца страявой падрыхтоўкай навабранцы 59-й школы падрыхтоўкі спецыялістаў па эксплуатацыі аўтамабільнай тэхнікі і рамонтных падраздзяленняў. Па плане заняткаў у іх — агнявая, тактычная падрыхтоўка, шэраг іншых прадметаў... І, вядома ж, «профільныя» — вывучэнне будовы тэхнікі і кіравання ёй на аўтадромах, бо тут пераважна рыхтуюць механікаў-кіроўцаў. Усе яны прыйшлі ў войска, ужо маючы ў сваім паслужным спісе правы вадзіцеля.

— Я прыбыў сюды 14 лістапада, — кажа радавы Уладзімір Ярашэвіч. — Мяне прызвалі на год пасля ўніверсітэта. Я вучыўся ў Баранавічах на інжынера-механіка. Паспеў крыху папрацаваць па спецыяльнасці. Да войска я рыхтаваўся, бо ведаў, што павестка ўсё роўна прыйдзе. Праўда, падчас вучобы я ўсе пяць гадоў жыў у інтэрнаце, таму адаптацыя для мяне — ужо звыклы працэс.

У 3-й школе падрыхтоўкі спецыялістаў танкавых і артылерыйскіх падраздзяленняў праходзяць тэарэтычныя заняткі. Маладых салдат знаёмяць з тым, як разбіраць і збіраць аўтамат Калашнікава. 25 чалавек, аднак, знаходзяцца тут менш за суткі. Яны ўжо атрымалі форму.

— Новыя вайскоўцы зараз запаўняюць аўтабіяграфію і шэраг іншых дакументаў. Па прыбыцці ў падраздзяленне на кожнага ваеннаслужачага заводзіцца асабовая справа, — кажа **старшы памочнік начальніка рэчавай службы тылу 72-га АНЦ старшы лейтэнант Аляксандр СТРУГ.** — А пасля ім пакажам, як падшываць падкаўнерыкі і падганяць пад сябе абмундзіраванне. Салдатам тэрміновай службы на зіму выдаецца шапка-аблавуха са штучнага футра, куртка і штаны, рэмень, бялізна, двое кальсонаў і абутак. Між іншым, у распрацоўцы знаходзіцца прапанова выдаваць асобныя камплекты абутку на халодны і цёплы час года.

У роце ж асноўны гаспадарчы цяжар кладзецца на яе старшыню.

— Першае, на што звяртаю ўвагу, — гэта на падтрыманне парадку ў казарме, — кажа **старшына 2-й роты гвардыі прапаршчык Дзмітрый САСУНКЕВІЧ.** — Гутару аб тым, што да вайсковай мэёмасці трэба ашчадна адносіцца. Вядома, з першага разу атрымліваецца не ўсё, але цярпенне і праца паступова перамагаюць. Асобная тэма — падшыванне падкаўнерыкаў. Не ўсе здагадваюцца спачатку, што без іх форма націрала б шыю...

Ну а чым жа харчуюцца салдаты? Завітаем у сталовую.

— Сёння ў меню на абед — расольнік, рысавая каша, смажаныя куранты, сок ябглычна-апельсінавы, булка і цыбуля. Таксама выдаецца рыба. Яе запякаюць, гатуюць з падліўкамі, смажаць з яе катлеты. Увогуле салдаты штодня атрымліваюць па 100 грамаў мяса, курыцы і рыбы. Што да дэсерту, то сталовыя заказваюць тварожныя сыркі, ёгурты...

Да канца лістапада ў Печы ўсяго прыбудзе каля 2,5 тыс. ваеннаслужачых. Ну а пасля таго, як для іх скончыцца курс пачатковай ваеннай падрыхтоўкі, 16 снежня яны прымуць прысягу.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*




(Злева направа) радавы Андрыян ГУЗОЎСКІ, камандзір аддзялення Павел МІРАНОВІЧ, радавыя Іван ДАВЫДАЎ і Аляксандр БЯЗМЕН.

## Кампетэнтна

**Начальнік 72-га аб'яднанага навучальнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў у Печах Уладзіслаў БУДЗІК** заявіў, што будзе праведзена паўторная атэстацыя афіцэрскага складу.

Ён зазначыў, што абстаноўка ў цэнтры стабільная, спакойная. «Ад моманту майго ўступлення на пасаду былі прынятыя наступныя захады: пераатэстацыя сяржанцкага складу — тыя, хто не прайшоў, былі адпраўленыя ў іншыя вайсковыя часці, на іх месца падабраныя вайскоўцы, з якімі цяпер праводзяцца заняткі для таго, каб пасля прызначыць іх на воінскія пасады сяржантаў. Акрамя таго, з афіцэрамі і прапаршчыкамі, занятымі выхаваннем асабістага складу, праводзяцца кантрольныя заняткі, па выніках якіх будзе праведзена атэстацыя. У перспектыве плануецца ўстаноўка сістэм відэаназірання ва ўсіх воінскіх частках нашага цэнтра.

З першых дзён знаходжання ваеннаслужачаму новага папаўнення дазволена мець зносіны з бацькамі. Сваякі маюць магчымасць пабываць у казарме, азнаёміцца з умовамі размяшчэння, побыту, сустрэцца з камандаваннем, атрымаць нумары тэлефонаў, па якіх яны ў любы момант могуць задаць пытанні».